# "Музыка ў сэрцах"

У дзяржаўнай установе адукацыі "Ашмянская дзіцячая школа мастацтваў" 27 студзеня для наведвальнікаў аддзялення дзённага знаходжання інвалідаў прайшла цікавая, пазнавальная і вясёлая экскурсія «Музыка ў сэрцах".

У фае школы вядучая Ганна Эдуардаўна Буйко расказала пра аддзяленні, якія функцыянуюць у школе. Правяла па кабінетах і класах, у якіх настаўнікі школы расказалі пра інструменты, прадэманстравалі спецыфіку гульні на іх. Выхаванцы АДзЗі пазнаёміліся з балалайкай, цымбаламі, баянам, флейтай, гітарай, скрыпкай, фартэпіяна, паслухалі вакальнае выкананне. Пабывалі ў класах мастацкага аддзялення.

Кантакт з жывой музыкай стварыў атмасферу радасці і настрою. Падараваў незабыўныя эмоцыі.









